Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па навуковай рабоце
БДУКМ
______________ В. Р. Языковіч
«___» ____________2020 г.
Рэгістрацыйны № ВД - ___/ вуч.

# МЕТОДЫКА РАБОТЫ З ФАЛЬКЛОРНЫМ КАЛЕКТЫВАМ

*Вучэбная праграма*
*ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне*
*для спецыяльнасці 1-16 01 06 Духавыя інструменты*
*(па напрамках), напрамку спецыяльнасці*
*1-16 01 06-11 Духавыя інструменты (народныя)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2020

Вучэбная праграма складзена ў адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту ОСВО 1-16 01 06-2013 вучэбнага плана ўстановы вышэйшай адукацыі па напрамку спецыяльнасці рэг. № С16-1-66/17 вуч.

**СКЛАДАЛЬНІК**

*А. Л. Карацееў,* прафесар кафедры духавой музыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*кафедра* аркестравага дырыжыравання і інструментоўкі ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі»;
*В. В. Старыкава,* дацэнт кафедры народна-інструментальнай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* духавой музыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 9 ад 18.04.2019);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 12.06.2019)

Адказны за рэдакцыю: Н. А.Ількевіч
Адказны за выпуск: А. Л. Карацееў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Методыка работы з фальклорным калектывам» з'яўляецца адной з асноўных музычна-тэарэтычных вучэбных дысцыплін у працэсе падрыхтоўкі кадраў для музычнага мастацтва, у тым ліку яго разнавіднасці – духавога мастацтва. Вывучэнне мастацка-выразных, тэхнічна-выканальніцкіх асаблівасцей народных духавых і ўдарных інструментаў на лепшых узорах нацыянальнай музычнай спадчыны і сусветнага музычнага мастацтва спрыяе фарміраванню ў студэнтаў дакладных ведаў аб функцыянаванні гэтых інструментаў, творчых калектываў, у якія ўваходзяць народныя духавыя і ўдарныя інструменты. Засваенне тэарэтычнага і практычнага матэрыялу вучэбнай дысцыпліны «Методыка работы з фальклорным калектывам» дазволіць будучым канцэртным выканаўцам, артыстам ансамбляў, аркестраў самастойна арганізоўваць творча-выканальніцкую ці педагагічную дзейнасць, дакладна вывучаць і чытаць аркестравыя партытуры, развіваць асабістыя навыкі, уменне кіраваць дзейнасцю адпаведнага саставу аркестра ці ансамбля, з якім яны будуць самастойна працаваць.

Вучэбная дысцыпліна «Методыка работы з фальклорным калектывам» павінна забяспечыць фарміраванне наступных кампетэнцый:

– *інавацыйна- метадычная дзейнасць*

ПК-20. Ужываць новыя інавацыйныя тэхналогіі навучання, мультымедыйныя тэхналогіі, электронныя падручнікі, фона- і відэазапісы.

ПК-21. Удасканальваць творча-выканальніцкую дзейнасць з творчым калектывам, распрацоўваць вучэбныя праграмы, вучэбна-метадычныя комплексы і іншую вучэбную літаратуру па творча-выканальніцкай дзейнасці фальклорнага калектыву (аркестр, капэла, ансамбль).

ПК-22. Арганізоўваць работу навукова-метадычных канферэнцый па праблемах развіцця народнай творчасці, творча-выканальніцкай дзейнасці фальклорных калектываў (аркестр, капэла, ансамбль).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*– творчая дзейнасць*

ПК-27. Рабіць уласныя аранжыроўкі, інструментоўкі, апрацоўкі і пераклады для фальклорных калектываў (аркестр, капэла, ансамбль).

ПК-28. Самастойна падбіраць рэпертуар, фарміраваць канцэртную праграму для розных фальклорных калектываў (аркестр, капэла, ансамбль).

ПК-29. Рыхтаваць творчыя выступленні фальклорных калектываў (аркестр, капэла, ансамбль) і весці канцэртную работу ў рэгіёне і па-за яго межамі.

Усведамленне студэнтамі тэарэтычнага і практычнага матэрыялу па вучэбнай дысцыпліне «Методыка работы з фальклорным калектывам» звязана з такімі вучэбнымі дысцыплінамі, як «Гісторыя мастацтваў», «Тэорыя музыкі», «Народна-інструментальная музычная культура Беларусі», «Народна-аркестравае выканальніцтва», «Народна-ансамблевае выканальніцтва», «Методыка выкладання дысцыплін», «Чытанне аркестравых партытур» і г. д.

*Мэта вучэбнай дысцыпліны* – падрыхтоўка высокакваліфікаваных спецыялістаў вышэйшай адукацыі, якія здольны ажыццяўляць творча-выканальніцкую дзейнасць як саліст-выканаўца, артыст таго ці іншага саставу аркестра, капэлы ці ансамбля, з якім яны будуць самастойна працаваць.

*Задачы вучэбнай дысцыпліны* – атрымаць тэарэтычныя і практычныя веды па методыцы работы з фальклорнымі калектывамі, ведаць тыпалогію гэтых калектываў, удасканаліць асабістыя навыкі па састаўленню плана работы з адпаведнымі фальклорнымі мастацкімі калектывамі ў галіне нацыянальнай мастацкай культуры, якая ўключае наступныя пытанні:

– падбірання партытур для розных саставаў ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў з мэтай эфектыўнай арганізацыі рэпетыцый;

– дакладнага афармлення зместу розных планаў работы з калектывамі (ансамбль, капэла, аркестр);

– дакладных ведаў аб сутнасці розных тыпаў агульна-калектыўных рэпетыцый з фальклорнымі калектывамі (ансамбль, капэла, аркестр);

– аптымальнага вызначэння партытур для розных саставаў ансамбляў, капэл, аркестраў народных інструментаў у



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адпаведнасці з патрабаваннямі да арганізацыі сацыякультурнай, музычна-асветніцкай і музычна-эстэтычнай дзейнасці мастацкага калектыву (ансамбль, капэла, аркестр);

– расшыфроўкі спецыяльнай тэрміналогіі па методыцы работы з фальклорным калектывам (ансамбль, капэла, аркестр).

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнты павінны *ведаць*:

– класіфікацыю, функцыянальныя і мастацка-выканальніцкія асаблівасці тыповых саставаў фальклорных калектываў (ансамбль, капэла, аркестр);

– сутнасць аркестрава-ансамблевага выканальніцтва і вызначэнне адпаведных задач пры выкананні музычных твораў;

– мастацка-творчыя, арганізацыйна-метадычныя асаблівасці работы па напісанні партытур для фальклорных калектываў (ансамбль, капэла, аркестр);

– этапы работы над музычнымі творамі, іх змест і задачы;

– выкананне розных тэматычных груп музычных твораў падчас працэсу фарміравання рэпертуару для фальклорных калектываў (ансамбль, капэла, аркестр);

– функцыянальныя, мастацка-выразныя, тэхнічна-выканальніцкія магчымасці народных духавых і ўдарных інструментаў і спецыфіка іх выкарыстання ў фальклорных калектывах (ансамбль, капэла, аркестр);

– сутнасць аркестрава-ансамблевай падрыхтоўкі падчас арганізацыі агульна-аркестравай рэпетыцыі;

– сацыякультурныя аспекты, асаблівасці арганізацыі канцэртна-выканальніцкай дзейнасці фальклорных ансамбляў, капэл, аркестраў народных духавых і ўдарных інструментаў і выкарыстанне разнастайных мастацка-тэматычных груп музычных твораў з улікам сацыяльнай і ўзроставай катэгорыі слухачоў, на якіх разлічана канцэртная праграма;

*умець*:

– распрацаваць розныя варыянты плана работы фальклорных калектываў (ансамбль, капэла, аркестр);

– вынайсці розныя тыпы рэпетыцыйных заняткаў для розных саставаў фальклорных калектываў (ансамбль, капэла, аркестр);

– выявіць розныя тыпы рэпетыцыйных заняткаў для ансамбля аркестравых груп у межах фальклорнага калектыву;

– вырашаць пытанні па асаблівасцях выканання аркестравых (ансамблевых) цяжкасцей для ўдзельнікаў той ці іншай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інструментальнай групы і ажыццяўляць неабходную магчымую адаптацыю адпаведнага музычнага матэрыялу;

– праводзіць аналітычную работу падчас адбору і вызначэння неабходных партытур для падрыхтоўкі музычных твораў;

– выконваць практычную работу падчас адбору і вызначэння партытур і правядзення рэпетыцыйных заняткаў з удзельнікамі фальклорных калектываў (ансамбль, капэла, аркестр) з мэтай вызначэння асобных фрагментаў меладычнага галасавядзення, кантрапункту, умовы адпаведнага транспаніравання і неабходнай змены тэсітуры гучання музычнага твору, улік жанрава-стылявых асаблівасцей пры выкананні ансамблям, капэлай ці аркестрам, якія ўключаюць народныя духавыя і ўдарныя інструменты;

*валодаць*:

– асноўнай тэрміналогіяй сферы духавога мастацтва, якая тычыцца дзейнасці фальклорных мастацкіх калектываў выканаўцы на нацыянальных духавых і ўдарных інструментах;

– прыёмамі работы з аўтэнтычнымі, жанрава-стылевымі і аўтарскімі сучаснымі музычнымі творамі для выканаўцаў на нацыянальных духавых і ўдарных інструментах;

– навыкамі пошуку ў розных фондах музычных твораў, неабходных для фальклорных мастацкіх калектываў, якія ўключаюць выканаўцаў на нацыянальных духавых і ўдарных інструментах;

– спецыфікай выкарыстання эпізадычных музычных інструментаў у складзе сучасных фальклорных мастацкіх калектываў, якія ўключаюць выканаўцаў на нацыянальных духавых і ўдарных інструментах;

– вызначэннем адпаведнага інтэрвалу транспазіцыі для нацыянальных беларускіх духавых і ўдарных інструментаў;

– тэхнікай чытання партытур музычных твораў і аналіза складу ансамбля, аркестра, іх груп ці асобных інструментаў у сучасных фальклорных мастацкіх калектывах.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Методыка работы з фальклорным калектывам» прадугледжана 108 гадзін, з якіх 48 гадзін – аўдыторныя заняткі (40 гадзін – лекцыі, 8 гадзін – семінары).

Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

*Дзённая форма навучання*

| Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | лекцыі | семінар. | | |
| **Уводзіны** | | | | |
| Раздзел I. Храналогія фарміравання фальклорных аркестраў, капэл і ансамбляў | **4** | **1** | **1** | |
| *Тэма 1.* Гісторыя развіцця ансамбляў, капэл і аркестраў духавых і ўдарных інструментаў у кантэксце сусветнай музычнай культуры | 2 | | | |
| *Тэма 2.* Сучасныя выканальніцкія формы творчай дзейнасці фальклорных калектываў, якія ўключаюць народныя духавыя і ўдарныя інструменты | 2 | 1 | 1 | тэст |
| Раздзел II. Тэарэтычныя аспекты методыкі работы з фальклорнымі ансамблямі, капэламі і аркестрамі, якія ўключаюць народныя духавыя і ўдарныя інструменты | **12** | **3** | **3** | |
| *Тэма 3.* Кіраўнік фальклорнага ансамбля, капэлы, аркестра – арганізатар выхаваўчай і вучэбна-творчай работы мастацкага калектыву | 4 | 1 | 1 | франтальнае апытанне |
| *Тэма 4.* Асаблівасці інтанавання народных духавых інструментаў у складзе ансамбля, капэлы, аркестра | 4 | 1 | 1 | франтальнае апытанне |
| *Тэма 5.* Сутнасць рэпетыцыйнай работы з транспануючымі інструментамі | 4 | 1 | 1 | індывідуальныя заданні |
| Раздзел III. Творча-практычныя аспекты методыкі работы з фальклорнымі ансамблямі, капэламі і аркестрамі, якія ўключаюць народныя духавыя і ўдарныя інструменты | **20** | **4** | **4** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| *Тэма 6.* Сутнасць работы з групай народных лабіяльных інструментаў у працэсе рэпетыцый з фальклорным ансамблям, капэлай, аркестрам | 4 | 1 | 1 | індывідуальныя заданні |
| *Тэма 7.* Сутнасць работы з групай народных язычковых інструментаў у працэсе рэпетыцый з фальклорным ансамблям, капэлай, аркестрам | 4 | 1 | 1 | індывідуальныя практыкаванні |
| *Тэма 8.* Работа з фальклорным ансамблям, капэлай, якія ўключаюць народныя духавыя і ўдарныя інструменты | 8 | 1 | 1 | індывідуальныя заданні |
| *Тэма 9.* Асноўныя тыпы рэпетыцый | 2 | | 0,5 | індывідуальныя практыкаванні |
| *Тэма 10.* Асноўныя віды канцэртна-выканальніцкай дзейнасці фальклорных ансамбляў, капэл, аркестраў і яе арганізацыя | 2 | 1 | 0,5 | індывідуальныя заданні |
| **Усяго…** | **36** | **8** | **8** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Уводзіны

Асноўная мэта вучэбнай дысцыпліны «Методыка работы з фальклорным калектывам». Сувязь і ўзаемаабумоўленасць з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі. Вучэбная дысцыпліна «Методыка работы з фальклорным калектывам» як галіна спецыяльных музычна-тэарэтычных ведаў, практычна-творчых навыкаў і ўменняў. Асноўныя задачы і змест вучэбнай дысцыпліны. Месца вучэбнай дысцыпліны ў падрыхтоўцы выканаўцаў на духавых і ўдарных народных інструментах на сучасным этапе развіцця нацыянальнай і сусветнай мастацкай культуры і духавога мастацтва.

Поліфункцыянальныя службовыя абавязкі кіраўніка фальклорнага ансамбля, капэлы ці аркестра, якія ўключаюць народныя духавыя і ўдарныя інструменты. Кіраўнік фальклорнага ансамбля, капэлы ці аркестра – арганізатар выхаваўчай і вучэбна-творчай работы мастацкага калектыву. Праблемы арганізацыі фальклорных ансамбляў, капэл ці аркестраў. Мэты, задачы і змест вучэбна-выхаваўчага працэсу ў фальклорным ансамблe, капэле ці аркестры. Мэты, задачы і формы музычна-тэарэтычнай падрыхтоўкі і эстэтычнага выхавання ў фальклорным ансамблe, капэле ці аркестры.

Сутнасць і вызначэнне тэрміна «Методыка работы з фальклорным калектывам» і яго параўнальны аналіз з тэрмінам «Методыка работы з музычным творам». Гісторыя эвалюцыі розных саставаў ансамбляў, аркестраў, метады даследавання (арганалагічны, музычна-эстэтычны).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел I. Храналогія фарміравання фальклорных аркестраў, капэл і ансамбляў

### *Тэма 1. Гісторыя развіцця ансамбляў, капэл і аркестраў духавых і ўдарных інструментаў у кантэксце сусветнай музычнай культуры*

Асаблівасці фарміравання ансамбляў, капэл і аркестраў духавых і ўдарных інструментаў у замежных краінах на першапачатковым этапе.

Асаблівасці фарміравання ансамбляў, капэл і аркестраў духавых і ўдарных інструментаў у Беларусі на першапачатковым этапе.

Перыядызацыя працэсу фарміравання ансамбляў, капэл і аркестраў духавых і ўдарных інструментаў у замежных краінах і яго этапы.

Перыядызацыя працэсу фарміравання ансамбляў, капэл і аркестраў духавых і ўдарных інструментаў у Беларусі і яго этапы.

### *Тэма 2. Сучасныя выканальніцкія формы творчай дзейнасці фальклорных калектываў, якія ўключаюць народныя духавыя і ўдарныя інструменты*

Тыпавыя выканальніцкія формы, у якіх выкарыстоўваюцца духавыя і ўдарныя інструменты. Спецыфіка ўключэння духавых і ўдарных інструментаў у сучасную выканальніцкую практыку (сольнае выканальніцтва, ансамблевае выканальніцтва, аркестравае выканальніцтва).

Сацыякультурныя асаблівасці сучаснай творчай дзейнасці фальклорных ансамбляў, капэл і аркестраў, якія ўключаюць народныя духавыя і ўдарныя інструменты.

## Раздзел ІІ. Тэарэтычныя аспекты методыкі работы з фальклорнымі ансамблямі, капэламі і аркестрамі, якія ўключаюць народныя духавыя і ўдарныя інструменты

### *Тэма 3. Кіраўнік фальклорнага ансамбля, капэлы, аркестра – арганізатар выхаваўчай і вучэбна-творчай работы мастацкага калектыву*

Поліфункцыянальныя службовыя абавязкі кіраўніка аматарскага фальклорнага ансамбля, капэлы, аркестра па арганізацыі выхаваўчай і вучэбна-творчай работы. Службовыя абавязкі кіраўніка прафесійнага фальклорнага ансамбля, капэлы, аркестра. Кіраўнік аматарскага фальклорнага ансамбля як арганізатар выхаваўчай і вучэбна-творчай работы аматарскага мастацкага калектыву. Праблемы арганізацыі аматарскіх фальклорных ансамбляў, капэл, аркестраў. Мэты, задачы і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

змест вучэбна-выхаваўчага працэсу ў аматарскіх фальклорных ансамблях, капэлах, аркестрах. Мэты, задачы і формы музычна-тэарэтычнай падрыхтоўкі і эстэтычнага выхавання.

*Тэма 4. Асаблівасці інтанавання народных духавых інструментаў у складзе ансамбля, капэлы, аркестра*

Асаблівасці інтанавання пры выкананні твораў на народных духавых інструментах з улікам іх тыпалогіі, дынаміка-акустычных асаблівасцей (тэхналагічныя недахопы і шляхі іх пераадольвання).

Спецыфіка, асноўныя віды і сістэмы наладжвання народных духавых інструментаў у складзе ансамбля, капэлы, аркестра духавых і ўдарных інструментаў.

Выкарыстанне розных спосабаў наладжвання з улікам арганалагічных асабівасцей народных духавых інструментаў.

Асаблівасці і спосабы карэкціроўкі інтанавання народных духавых інструментаў у працэсе сольнага ці сумеснага выканаўства.

Музычны гук і яго асаблівасці ўспрымання ў гучанні духавых і ўдарных музычных інструментаў. Асноўныя віды музычнага слыха.

Галоўныя састаўныя часткі народных духавых і ўдарных музычных інструментаў.

Фактары, якія абумоўліваюць спецыфіку прыёмаў гуказдабывання на народных духавых інструментах.

*Тэма 5. Сутнасць рэпетыцыйнай работы з транспануючымі інструментамі*

Сутнасць тэрмінаў «транспазіцыя», «транспаніраванне» і іх выкарыстанне ў рэпетыцыйнай рабоце з фальклорным ансамблям, капэлай, аркестрам.

Правядзенне рэпетыцыйнай работы з улікам класіфікацыі транспануючых інструментаў (асаблівасці тэсітуры гучання). Паняцце «строй інструмента» і яго разнавіднасці.

Валоданне асаблівасцю натацыі інструментаў у ансамблевых, аркестравых партытурах і партыях і спецыфіка работы з гэтымі інструментамі падчас правядзення дробнагрупавых ці агульна-калектыўных рэпетыцый з фальклорным ансамблям, капэлай, аркестрам.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел III. Творча-практычныя аспекты методыкі работы з фальклорнымі ансамблямі, капэламі і аркестрамі, якія ўключаюць народныя духавыя і ўдарныя інструменты

### *Тэма 6. Сутнасць работы з групай народных лабіяльных інструментаў у працэсе рэпетыцый з фальклорным ансамблям, капэлай, аркестрам*

Група лабіяльных інструментаў і іх функцыянальнае выкарыстанне ў складзе ансамбля ці аркестра духавых інструментаў.

Строй, натацыя, дыяпазон гучання, функцыянальная спецыфіка, характарыстыка мастацка-выразных і тэхнічна-выканальніцкіх асаблівасцей лабіяльных духавых інструментаў.

Спецыфіка работы з гэтымі інструментамі падчас правядзення дробнагрупавых ці агульна-калектыўных рэпетыцый.

### *Тэма 7. Сутнасць работы з групай народных язычковых інструментаў у працэсе рэпетыцый з фальклорным ансамблям, капэлай, аркестрам*

Група народных язычковых інструментаў і іх функцыянальнае выкарыстанне ў складзе ансамбля. Выкарыстанне народных язычковых інструментаў у фальклорным ансамбле, капэле, аркестры.

Строй, натацыя, дыяпазон гучання, функцыянальная спецыфіка, характарыстыка мастацка-выразных і тэхнічна-выканальніцкіх асаблівасцей народных язычковых духавых інструментаў.

Спецыфіка работы з гэтымі інструментамі падчас правядзення дробнагрупавых ці агульна-калектыўных рэпетыцый.

### *Тэма 8. Работа з фальклорным ансамблем, капэлай, якія ўключаюць народныя духавыя і ўдарныя інструменты*

Работа з асноўнымі складамі ансамбляў, капэл, якія ўключаюць народныя духавыя і ўдарныя інструменты (аднайменныя, роднасныя, змешаныя).

Работа па вывучэнні функцыянальных, мастацка-выканальніцкіх асаблівасцей ансамбляў, капэл, якія ўключаюць народ-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ныя духавыя і ўдарныя інструменты, знаёмства з варыянтамі іх выкарыстання у сучаснай выканальніцкай практыкі.

Размеркаванне на рэпетыцыі галасоў у ансамблях, капэлах з выкарыстаннем народных духавых і ўдарных інструментаў і іх нотна-графічнае афармленне.

*Тэма 9. Асноўныя тыпы рэпетыцый*

Вызначэнне, тыпалогія, функцыянальныя, мастацка-выканальніцкія асаблівасці правядзення асноўных тыпаў рэпетыцыйных заняткаў з фальклорным ансамблем, капэлай, аркестрам, якія ўключаюць народныя духавыя і ўдарныя інструменты.

Асаблівасці правядзення рэпетыцыйных заняткаў. Змест ардынарнай рэпетыцыі.

Карэктурная рэпетыцыя.

Прагонная рэпетыцыя.

Генеральная рэпетыцыя.

*Тэма 10. Асноўныя віды канцэртна-выканальніцкай дзейнасці фальклорных ансамбляў, капэл, аркестраў і яе арганізацыя*

Вызначэнне, тыпалогія, функцыянальныя, мастацка-выканальніцкія асаблівасці правядзення асноўных відаў канцэртна-выканальніцкай дзейнасці (дывертысментныя, тэматычныя, монатэматычныя, юбілейныя і іншыя разнастайнасці канцэртных выступленняў).

Сацыякультурныя асаблівасці сучаснай творчай дзейнасці мастацкіх калектываў.

Сучасныя формы дзейнасці фальклорных ансамбляў, капэл, аркестраў, якія ўключаюць народныя духавыя і ўдарныя інструменты.

Праблема фарміравання рэпертуару ў фальклорным мастацкім калектыве.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

| Адзнака | Паказальнікі адзнакі |
|---|---|
| 1 (адзін) | Веданне студэнтам тэрміналогіі, асобных фактаў, з'яў, крытэрыяў і форм кантролю вывучаемай дысцыпліны |
| 2 (два) | Устойлівая фіксацыя ў памяці студэнта асобных фактаў, з'яў і тэрмінаў вывучаемай дысцыпліны |
| 3 (тры) | Аднаўленне студэнтам часткі праграмнага матэрыялу па памяці. Ізаляванасць ведаў па асобных тэмах, персаналіях, крыніцах |
| 4 (чатыры) | Недастаткова сістэмнае ўсведамленне студэнтам вывучаемай дысцыпліны (ролі і месца музычна-педагагічнай кваліфікацыі і культуры выкладчыка ў сучаснай культурна-адукацыйнай прасторы, шляхоў і сродкаў засваення педагагічнага майстэрства ў вучэбна-выхаваўчай дзейнасці). Веданне спецыяльнай вучэбна-педагагічнай, навукова-метадычнай і нотнай літаратуры па музычна-эстэтычнаму выхаванню і навучанню, методыцы работы з фальклорным калектывам |
| 5 (пяць) | Усведамленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу (апісанне праблемнага поля вучэбна-выхаваўчага працэсу, спецыфікі музычнага мастацтва; сістэмы музычнай адукацыі па падрыхтоўцы выканаўцаў на народных духавых і ўдарных інструментах; веданне асноўных форм і метадаў засваення музычнага мастацтва ў розных тыпах вучэбных устаноў і г. д.).<br>Наяўнасць неістотных памылак |
| 6 (шэсць) | Сістэмнае ўсведамленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу. Веданне спецыяльнай вучэбна-педагагічнай, навукова-метадычнай і нотнай літаратуры па музычна-эстэтычнаму выхаванню і навучанню, методыцы работы з фальклорным калектывам.<br>Наяўнасць неістотных памылак |
| 7 (сем) | Трывалыя веды па асноўных кірунках дзейнасці фальклорных калектываў, падрыхтоўкі выканаўцаў на народных духавых і ўдарных інструментах, раскрыццё праблем музычнай адукацыі ў сучасных умовах развіцця культуры.<br>Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| 8 (восем) | Дастатковыя веды па асноўных напрамках падрыхтоўкі кіраўнікоў фальклорных калектываў, выканаўцаў на народных духавых і ўдарных інструментах. Свабоднае ўжыванне вучэбнага матэрыялу дысцыпліны. Раскрыццё сутнасці тэарэтычных пытанняў, пацверджанне асабістых вывадаў канкрэтнымі прыкладамі з вопыту работы лепшых кіраўнікоў фальклорных калектываў, выкладчыкаў у розных тыпах вучэбных устаноў.<br>Веданне асноўнай і дадатковай літаратуры па спецыяльных дысцыплінах. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак |
| 9 (дзевяць) | Трывалыя веды па асноўных напрамках дзейнасці кіраўнікоў фальклорных калектываў, падрыхтоўкі выканаўцаў на духавых і ўдарных інструментах. Усведамленне студэнтам вучэбна-творчага і вучэбна-педагагічнага працэсу ў фальклорных мастацкіх калектывах, розных тыпах вучэбных устаноў, асэнсаванне вопыту вядучых кіраўнікоў фальклорных мастацкіх калектываў, спецыялістаў-выкладчыкаў па падрыхтоўцы выканаўцаў на духавых і ўдарных інструментах. Раскрыццё сутнасці тэарэтычных пытанняў, пацверджанне аргументамі і фактамі. Уменне аналізаваць формы і метады арганізацыі творчага вучэбна-выхаваўчага працэсу ў фальклорных мастацкіх калектывах, розных тыпах вучэбных устаноў па падрыхтоўцы выканаўцаў на народных духавых і ўдарных інструментах, карыстацца вучэбна-педагагічнай, навукова-метадычнай і нотнай літаратурай па музычна-эстэтычнаму выхаванню і навучанню, методыкі работы з фальклорным калектывам.<br>Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак |
| 10 (дзесяць) | Поўныя, трывалыя і глыбокія веды па асноўных напрамках падрыхтоўкі кіраўнікоў фальклорных мастацкіх калектываў, выканаўцаў на народных духавых і ўдарных інструментах. Глыбокае асэнсаванне праблем музычнага выхавання і навучання выканаўцаў на духавых і ўдарных інструментах. Здольнасць выкарыстоўваць свае веды ў кантэксце прафесійнай вытворчай выканальніцкай дзейнасці кіраўнікоў фальклорных мастацкіх калектываў, педагагічнай дзейнасці выкладчыкаў па падрыхтоўцы выканаўцаў на народных духавых і ўдарных інструментах. Аналізаваць праблемы, якія існуюць у практыцы навучальных устаноў. Кваліфікаванае выкарыстанне вучэбна-педагагічнай, навукова-метадычнай і нотнай літаратуры па музычна-эстэтычнаму выхаванню і навучанню, методык работы з фальклорным калектывам.<br>Адсутнасць памылак |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Прыкладная тэматыка і метадычныя ўказанні да семінарскіх заняткаў вучэбнай дысцыпліны

Тэматыка семінарскіх заняткаў для студэнтаў дзеннай формы навучання ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці 1-16 01 06 Духавыя інструменты (па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-16 01 06-11 Духавыя інструменты (народныя).

### Семінар № 1
**(*1 гадзіна*)**

1. Месца вучэбнай дысцыпліны «Методыка работы з фальклорным калектывам» у падрыхтоўцы кіраўнікоў аматарскіх фальклорных мастацкіх калектываў. Вучэбная дысцыпліна «Методыка работы з фальклорным калектывам» як адна з асноўных музычна-тэарэтычных вучэбных дысцыплін у працэсе падрыхтоўкі кадраў для духавога мастацтва.
2. Тэрміналогія вучэбнай дысцыпліны «Методыка работы з фальклорным калектывам», сувязь з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі.
3. Сучасныя выканальніцкія формы творчай дзейнасці фальклорных калектываў, якія ўключаюць народныя духавыя і ўдарныя інструменты.

*Літаратура*

1. *Коротеев, А. Л.* Использование функционально-ролевых игр в процессе подготовки специалистов духового искусства высшей квалификации Беларуси (народные и оркестровые духовые, ударные инструменты) / А. Л. Коротеев // Игровые технологии в современном воспитательном процессе : материалы Респ. науч.-практ. конф., Мозырь, 12–13 февр. 2004 г. : в 3 ч. – Мозырь, 2004. – Ч. 1. – С. 18–21.

2. *Коротеев, А. Л.* Нравственно-эстетические и художественно-творческие критерии формирования профессиональных способностей исполнителей на духовых инструментах / А. Л. Коротеев // Маральна-эстэтычнае выхаванне моладзі сродкамі мастацтва і літаратуры : матэрыялы Міжнар. навук. канф., 24–25 лют. 2000 г. / рэдкал.: А. У. Пазнякоў (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. ун-т культуры, 2000. – С. 63–67.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Семінар № 2
### (*3 гадзіны*)

1. Кіраўнік фальклорнага ансамбля, капэлы, аркестра – арганізатар выхаваўчай і вучэбна-творчай работы мастацкага калектыву.

2. Асабістыя якасці кіраўніка фальклорнага ансамбля, капэлы, аркестра.

3. Патрабаванні да выканальніцкай, метадычнай падрыхтоўкі кіраўніка фальклорнага ансамбля, капэлы, аркестра.

4. Асаблівасці інтанавання народных духавых інструментаў у складзе ансамбля, капэлы, аркестра.

5. Сутнасць рэпетыцыйнай работы з транспануючымі інструментамі.

*Літаратура*

*1. Коротеев, А. Л.* Особенности развития духового искусства Восточной Европы: органологическое исследование и эволюция форм народно-инструментального исполнительства на духовых и ударных инструментах / А. Л. Коротеев // Украіньска культура в іменах і дослідженнях. Наукові записки Рівненьского державного інституту культури. – Віп. III – Рівне, 1998. – С. 296–320.

*2. Коротеев, А. Л.* Фольклорные духовые инструменты белорусов в этнокультурном воспитании и художественном образовании детей и молодежи (от музыкальной игрушки до разнообразия национального инструментария) / А. Л. Коротеев // «Этнашкола» ў сучасным адукацыйным працэсе: вопыт станаўлення і перспектывы развіцця (да 10-годдзя існавання) / уклад. і навук. рэдакт. праф. І. І. Сучкоў. – Минск, 2004. – С. 87–94.

*3. Коротеев. А. Л.* Функциональные и этноорганологические особенности белорусских народных духовых инструментов / А. Л. Коротеев // X Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры, Мінск, 24–26 мая 2004 г. / рэдкал.: М. А. Бяспалая (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2005. – С. 66–72.

*4. Крамко, А. Я.* Беларускія народныя духавыя інструменты : вучэб. дапам. / А. Я. Крамко – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – 34 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Семінар № 3
### (*4 гадзіны*)

1. Сутнасць работы з групай народных лабіяльных інструментаў у працэсе рэпетыцый з фальклорным ансамблем, капэлай, аркестрам.

2. Сутнасць работы з групай народных язычковых інструментаў у працэсе рэпетыцый работы з фальклорным ансамблем, капэлай, аркестрам.

3. Работа з фальклорным ансамблям, капэлай, якія ўключаюць народныя духавыя і ўдарныя інструменты.

4. Правядзенне асноўных тыпаў рэпетыцый.

5. Асноўныя віды канцэртна-выканальніцкай дзейнасці фальклорных ансамбляў, капэл, аркестраў і яе арганізацыя.

*Літаратура*


1. *Антоневич, В. А.* Народное исполнительское искусство как один из источников обогащения профессионального творчества на современном этапе / В. А. Антоневич // Вопросы культуры и искусства Белоруссии : респ. межвед. сб. – Мінск, 1982. – Вып. 1. – С. 68–71.

2. *Мишуров, Г. С.* Белорусское народно-инструментальное искусство: традиции и современность / Г. С. Мишуров. – Минск : Бел. гос. ун-т культуры, 2002. – 300 с.

3. *Назина, И. Д.* Белорусские народные музыкальные инструменты: самозвучащие, ударные, духовые / И. Д. Назина / ред. М. Я. Гринблат. – Минск : Наука и техника, 1979. – 144 с.

4. *Назіна, І. Д.* Беларускія народныя музычныя інструменты / І. Д. Назіна. – Мінск : Беларусь, 1997. – 239 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Літаратура

*Асноўная*

*1.* Беларуская народная інструментальная музыка / Фоназапісы, натацыя / рэд. і сістэматызацыя найгрышаў, уступ. арт. і навук. камент. І. Д. Назінай. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – 655 с.

*2.* Белорусские народные наигрыши / сост. и авт. вступ. ст. И. Д. Назина ; под общ. ред. В. Петрова. – М. : Музыка, 1986. – 12 с.

*3. Гром, У. М.* Дударэньку-гаспадэньку : рэпертуарны зб. для аматараў ігры на дудзе / У. М. Гром. – Мінск : БелІПК, 1999. – 54 с.

*4. Гром, У. М.* Заіграйце, музыкі! : рэпертуарны зб. для фальклорных катектываў : у 2 ч. / У. М. Гром. – Мінск : Чатыры чвэрці, 1998. – Ч. 1. – 111 с.

*5. Гром, У. М.* Заіграйце, музыкі! : рэпертуарны зборнік для фальклорных калектываў : у 2 ч. / У. М. Гром. – Мінск : Чатыры чвэрці, 1998. – Ч. 2. – 155 с.

*6. Гром, У. М.* Сядзіць галубок над крыніцаю : зб. бел. нар. песень / У. М. Гром // Беларус. ун-т культуры. – Мінск : Беларус. ун-т культуры, 1999. – 68 с.

*7. Гром, У. М.* Школа ігры на беларускіх народных духавых інструментах : вучэб.-метад. дапам. : у 2 ч. / У. М. Гром, А. Я. Крамко, І. А. Мангушаў. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – Ч. 1. Сольнае выкананне. – 259 с.

*8. Гром, У. М.* Школа ігры на беларускіх народных духавых інструментах : вучэб.-метад. дапам. : у 2 ч. / У. М. Гром, А. Я. Крамко, І. А. Мангушаў. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – Ч. 2 : Ансамблевае выкананне. – 217 с.

*9. Коротеев, А. Л.* Особенности развития духового искусства Восточной Европы: органологическое исследование и эволюция форм народно-инструментального исполнительства на духовых и ударных инструментах / А. Л. Коротеев // Україньска культура в іменах і дослідженнях. Наукові записки Рівненьского державного інституту культури. – Віп. III – Рівне, 1998. – С. 296–320.

*10. Коротеев, А. Л.* Фольклорные духовые инструменты белорусов в этнокультурном воспитании и художественном образовании детей и молодежи (от музыкальной игрушки до раз-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нообразия национального инструментария) / А. Л. Коротеев // «Этнашкола» ў сучасным адукацыйным працэсе: вопыт станаўлення і перспектывы развіцця (да 10-годдзя існавання) / уклад. і навук. рэдакт. праф. І. І. Сучкоў. – Мінск, 2004. – С. 87–94.

*11. Коротеев, А. Л.* Функциональные и этноорганологические особенности белорусских народных духовых инструментов / А. Л. Коротеев // X Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры, Мінск, 24–26 мая 2004 г. / рэдкал.: М. А. Бяспалая (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2005. – С. 66–72.

*12. Казловіч, М. І.* Змест каляндарна-абходнай абраднасці беларусаў і асабліывасці яго гукаінструментальнага выяўлення / М. І. Казловіч // Весці Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. – 2002. – № 2. – С. 47–52.

*13. Крамко, А. Я.* Беларускія народныя духавыя інструменты : вучэб. дапам. / А. Я. Крамко. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – 34 с.

*14. Мишуров, Г. С.* Белорусское народно-инструментальное искусство: традиции и современность / Г. С. Мишуров. – Минск : Беларус. гос. ун-т культуры, 2002. – 300 с.

*15. Назина, И. Д.* Белорусские народные музыкальные инструменты: самозвучащие, ударные, духовые / И. Д. Назина / ред. М. Я. Гринблат. – Минск : Наука и техника, 1979. – 144 с.

*16. Назіна, І. Д.* Беларускія народныя музычныя інструменты / І. Д. Назіна. – Мінск : Беларусь, 1997. – 239 с.

*17. Яконюк, Н. П.* Народно-оркестровая культура Белоруссии: традиции и новаторство / Н. П. Яконюк // Роль оркестров народных инструментов в межэтническом общении : сб. / Рос. акад. музыки им. Гнесиных. – М., 1999. – Вып. 153. – С. 49–75.

*Дадатковая*

*1. Алексеева, Н.* Новая жизнь пастушьего рожка / Н. Алексеева // Советская музыка. – 1982. – № 8. – С. 66–67.

*2. Алефірэнка, В.* Параўнальна-марфалагічны аналіз беларускай і польскай дуды / В. Алефірэнка // Музычная культура Беларусі: пошукі і знаходкі : матэрыялы VII Навуковых чытанняў памяці Л. С. Мухарынскай (1906–1987). – Мінск, 1998. – С. 72–76.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. *Андерсен, А.* Новый самоучитель игры на окарине / А. Андерсен. – М. : Издание Ю. Г. Циммермана, 1889. – 27 с.

4. *Антоневич, В. А.* Народное исполнительское искусство как один из источников обогащения профессионального творчества на современном этапе / В. А. Антоневич // Вопросы культуры и искусства Белоруссии : респ. межвед. сб. – Минск, 1982. – Вып. 1. – С. 68–71.

5. *Благовещенский, И. П.* К истории белорусской народной инструментальной музыки / И. П. Благовещенский // Благовещенский И. П. Некоторые вопросы музыкального искусства (педагогика, эстетика, фольклор). – Минск, 1965. – С. 103–143.

6. *Бярбераў, У.* Дудка беларуская / У. Бярбераў // Культура. – 1992. – № 5. – С. 3.

7. *Бярбераў, У.* Жалейка / У. Бярбераў // Культура. – 1992. – № 6. – С. 8.

8. *Бярбераў, У.* Іду да дудароў / У. Бярбераў // Культура. – 1992. – № 7. – С. 7.

9. *Гром, У. М.* Дуда ў фальклорна-інструментальнай творчасці беларусаў / У. М. Гром // «Этнашкола» ў сучасным адукацыйным працэсе: вопыт станаўлення і перспектывы развіцця (да 10-годдзя існавання) / уклад. і навук. рэдакт. праф. І. І. Сучкоў. – Мінск, 2004. – С. 81–86.

10. *Божок, І.* Урокі гри на сопілці. Урок І. / І. Божок // Рідні джэрэла. Науково-методичний часопис для вчителів української діаспори. – 1998. – № 1–2. – С. 42–44.

11. *Божок, І.* Недільна школа сопілкаря / І. Божок // Рідні джэрэла. Науково-методичний часопис для вчителів української діаспори. – 1998. – № 3. – С. 43–47.

12. *Волынский, Л.* Новейшая практическая и легкопонятная школа для окарины, удобная для самоучения [Ноты] : с добавлением 30 пьес для одной окарины и 3 пьес для 2 окарин / Л. Волынский. – Киев : Г. И. Ииндржишека, 1897. – 32 с.

13. Інструментальная музыка Беларусі XVIII стагоддзя [Ноты] : рэпертуар для салістаў-інструменталістаў, камерных аркестраў і анс. / рэсп. метад. кабінет па навуч. установах мастацтваў і культуры ; склад. В. У. Дадзіёмава. – Мінск : [б. в.], 1991. – 114 с.

14. *Имханицкий, М. И.* Сколь народны народные инструменты / М. И. Имханицкий // Народныя музычныя інструменты ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацкай культуры ХХ стагоддзя : зб. навуковых артыкулаў / рэдкал.: Н. П. Яканюк (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1999. – С. 8–20.

*15. Козлова, А.* Над поставским Поозерьем плакала жалейка… / А. Козлова // Рэспубліка. – 17 чэрвеня 1998. – С. 5.

*16. Коротеев, А. Л.* Бытование амбушюрных духовых музыкальных инструментов в Беларуси (по материалам археологических изысканий, архивных исследований и анализа печатных изданий в контексте славянской органологии) / А. Л. Коротеев // IV Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіееўскія чытанні, прысвечанныя Дням славянскага пісьменства і культуры : матэрыялы чытанняў, Мінск, 24–26 мая 1998 г. : у 2 ч. / ЕГУ, БУК ; рэдкал.: Пазнякоў А. У. (адк. ред.) [і інш.]. – Мінск, 1999. – Ч. 2. – С. 168–176.

*17. Коротеев, А. Л.* Генезис образования специалистов духового исполнительского искусства Беларуси (народно-инструментального, профессионального и любительского) / А. Л. Коротеев // Музыкальное искусство и музыкальное образование на рубеже веков : материалы науч. конференций «Беларусь и музыкальное наследие ХХ столетия: поиски и обретения», 29–30 нояб. 2001 г., Минск, «Музыкальное образование в контексте художественной культуры», 10–11 дек. 2002 г., Минск. – Вып. 1. – Минск, 2004. – С. 138–146.

*18. Коротеев, А. Л.* Дисбаланс квалификационно-педагогических компонентов системы подготовки специалистов профессионального и любительского духового искусства Беларуси / А. Л. Коротеев // Проблемы развития педагогического образования : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 17 дек. 2004 г. / Бел. гос. пед. ун-т имени М. Танка ; редкол.: К. В. Гавриловец [и др.] ; отв. ред. А. В. Торхов, З. С. Курбыко. – Минск, 2005. – С. 375–377.

*19. Коротеев, А. Л.* Духовое искусство Беларуси: жанрово-стилистические поиски и перспективы развития / А. Л. Коротеев // Музыкальное искусство на рубеже столетий : материалы Международной научной конференции «Музыкальное творчество и XXI век: традиции, новации и перспективы», Минск, 21 апр. 2000 г. – Минск, 2000. – С. 41–45.

*20. Коротеев, А. Л.* Использование функционально-ролевых игр в процессе подготовки специалистов духового искусства высшей квалификации Беларуси (народные и оркестровые духовые, ударные инструменты) / А. Л. Коротеев // Игровые тех-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нологии в современном воспитательном процессе : материалы респ. науч.-практ. конф., Мозырь, 12–13 февр. 2004 г. : в 3 ч. – Мозырь, 2004. – Ч. 1. – С. 18–21.

21. *Коротеев, А. Л.* Нравственно-эстетические и художественно-творческие критерии формирования профессиональных способностей исполнителей на духовых инструментах / А. Л. Коротеев // Маральна-эстэтычнае выхаванне моладзі сродкамі мастацтва і літаратуры : матэрыялы Міжнар. навук. канф., 24–25 лют. 2000 г. / рэдкал.: А. У. Пазнякоў (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2000. – С. 63–67.

22. *Караткевич, А. А.* Аб некаторых метадычных падыходах да навучання ігры на дудцы (пачатковая ступень музычнай адукацыі) белорусов // «Этнашкола» ў сучасным адукацыйным працэсе: вопыт станаўлення і перспектывы развіцця (да 10-годдзя існавання) / уклад. і навук. рэд. праф. І. І. Сучкоў. – Мінск, 2004. – С. 229–237.

23. *Карацееў, А. Л.* Забеспячэнне працэсу падрыхтоўкі спецыялістаў у ВНУ культуры і мастацтваў Беларусі (вучэбна-метадычныя і арганізацыйныя аспекты) // Кафедра як асноўны цэнтр падрыхтоўкі спецыялістаў да дзейнасці ў сацыякультурнай і інфармацыйна-камунікатыўнай сферах : матэрыялы навук.-метад. канф., 19–20 лют. 2004 г. / рэдкал.: А. І. Смолік (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2005. – С. 51–54.

24. *Карацееў, А. Л.* Народны духавы музычны інструментарый Беларусі як гістарычная сведка развіцця нацыянальнай культуры і яго месца ў сусветнай арганалогіі і арганафоніі // зб. тэзісаў дакладау на навук.-метад. канф. прафесарска-выкладчыцкага складу. – Мінск, 1993. – Ч. 1. – С. 21–26.

25. *Карацееў, А. Л.* Неардынарная з’ява нацыянальна-выканальніцкага адраджэння // Веснік БДУ культуры і мастацтваў. – 2005. – № 5. – С. 119–122.

26. *Карацееў, А. Л.* Роля прагрэсіўных тэхналогій падрыхтоўкі спецыялістаў духавога мастацтва ў працэсе распрацоўкі сучасных адукацыйных стандартаў // Стандарты вышэйшай культуралагічнай і мастацкай адукацыі: тэарэтыка-метадалагічныя аспекты : матэрыялы навук.-метад. канф., 2–3 лют. 1999 г. / рэдкал.: А. І. Смолік (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1999. – С. 91–96.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*27. Мангушаў, І. А.* Праблемы рэканструкцыі, вырабу і ўкараненне ў сучасную музычную культуру старажытных фальклорных духавых інструментаў беларусаў // «Этнашкола» ў сучасным адукацыйным працэсе: вопыт станаўлення і перспектывы развіцця (да 10-годдзя існавання) / уклад. і навук. рэд. праф. І. І. Сучкоў. – Мінск, 2004. – С. 220–229.

*28.* Музыкальные инструменты мира : илюстрированная энциклопедия / пер. с англ. Т. В. Лихач ; худ. обл. М. В. Драко. – Минск : Попурри, 2001. – 320 с.

*29.* Народные музыкальные инструменты и инструментальная музыка : сб. статей и материалов в двух частях. – М. : Сов. композитор, 1987. – Ч. 1. – 264 с.

*30. Назина, И. Д.* Становление и развитие белорусского этноинструментоведения как специальной научной дисциплины // Белорусская этномузыкалогия: очерки истории (XIX–XX вв.) / И. Д. Назина [и др.] ; под. ред. З. Можейко. – Минск, 1997. – С. 199–234.

*31.* Народные музыкальные инструменты и инструментальная музыка : сб. статей и материалов : в 2 ч. / общ. ред. Е. В. Гипиуса. – М. : Сов. композитор, 1988. – Ч. 2. – 327 с.

*32. Ничков, Б. В.* Фольклорные духовые инструменты в устной поэзии белорусов / Б. В. Ничков // «Этнашкола» ў сучасным адукацыйным працэсе: вопыт станаўлення і перспектывы развіцця (да 10-годдзя існавання) / уклад. і навук. рэд. праф. І. І. Сучкоў. – Мінск, 2004. – С. 208–220.

*33.* Новая радасць стала [ноты] : хрэстаматыя па духоўнай харавой музыцы / Беларус. ін-т праблем культуры ; уклад.: А. В. Пякуцька, З. Л. Леановіч, В. П. Маеўская ; муз. рэд. Я. М. Рэўтовіч. – Мінск : БелІПК, 1995. – 60 с.

*34.* Помнікі музычнай культуры Беларусі: інструментальная музыка XIX стагоддзя / Беларус. ін-т праблем культуры ; уклад. А. І. Ахвердава. – Мінск : БелІПК, 993. – 90 с.

*35. Прывалаў, Н.* Народныя музычныя інструменты Беларусі / Н. Прывалаў. – Мінск : Друкарня Янбелкульту, 1928. – 39 с.

*36. Сёке, П.* Существовала ли музыка до возникновения жизни на Земле? / П. Сёке // Иностранная литература. – 1983. – № 9. – С. 204–207.

*37. Скарабагатчанка, А. В.* Беларускі музычны фальклор [ноты] : інструментальная традыцыя / А. Скарабагатчанка /

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэсп. навук.-метад. цэнтр. культуры ; Мін. ін-т культуры. – Мінск : [б. в.], 1990. – 161 с.

*38. Скарабагатчанка, А.* Народная інструментальная культура Беларускага Паазер'я : вучэб. дапам. / А. Скарабагатчанка. – Мінск : Беларус. навука, 1997. – 471 с.

*39. Скорабагатаў, В.* Зайгралі спадчанныя куранты: цыкл нарысаў з гісторыі прафесійнай музычнай культуры Беларусі / В. Скорабагатаў. – Мінск : Тэхналогія, 1998. – 154 с.

*40. Філіповіч, А.* Дудка... на каленях / А. Філіповіч // Культура. – 2000. – № 23–24. – С. 4.

*41. Черных, А.* Советское духовое инструментальное искусство : справочник / А. Черных. – М. : Сов. композитор, 1989. – 320 с.

*42. Яконюк, Н. П.* Народно-инструментальная музыкальная культура письменной традиции Беларуси: атрибутивные типологические признаки / Н. П. Яконюк // Весці Беларус. дзярж. акад. музыкі. – 2002. – № 2. – С. 44–46.

*43. Яканюк, Н. П.* Народна-інструментальная музычная культура Беларусі: да пытання фарміравання нацыянальнага інструментарыя / Н. П. Яканюк // Культура Беларусі: спадчына і сучаснасць. – Тэзісы дакладаў на навук. канф., 18–19 крас. 1996 г. / Беларус. ун-т культуры. – Мінск : Беларус. ин-т культуры, 1997. – 78 с.

*44. Moszynski, K.* Polesie Wschodnie. Materjały etnograficzne z wschodniej części b. powiatu mozyrskiego oraz z powiatu rzeczyckiego. – Warszawa : Wydawnictno Kasy im. Mianowskiego, 1928. – 304 s.

*45. Pietkiewicz, Cz.* Polesie Rzecsyckie. Kultura duchowa Polesia Rzeczyckiego : materjały etnograficzne : w 2 cz. – Warszawa : Towarzystwo Naukowe warszawskie, 1938. – Cz. 2. – 459 s.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Рэкамендаваныя сродкі дыягностыкі

Для дыягностыкі прафесійных кампетэнцый, выяўлення ўзроўню засваення ведаў і ўменняў па вучэбнай дысцыпліне «Методыка работы з фальклорным калектывам» рэкамендаваны наступны інструментарый:

– падрыхтоўка пісьмовых кантрольных работ (заданняў);

– напісанне рэфератаў па асобных раздзелах дысцыпліны;

– састаўленне варыянтаў індывідуальнага плана работы выкладчыка навучальнай установы па правядзенні рэпетыцыі аркестра духавых і ўдарных інструментаў;

– састаўленне варыянтаў індывідуальных планаў і заданняў па засваенні выканальніцкіх навыкаў для ўдзельнікаў аматарскага аркестра, ансамбля духавых і ўдарных інструментаў;

– напісанне дакладаў на навуковыя канферэнцыі па асобных тэмах;

– франтальнае вуснае апытанне студэнтаў на семінарах.

## Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў

Дзеля ажыццяўлення самастойнай падрыхтоўкі і засваення неабходных ведаў па вучэбнай дысцыпліне «Методыка работы з фальклорным калектывам» студэнтам прапануюцца наступныя практычныя заняткі:

– у працэсе выбару музычнага твора вызначыць яго дакладны характар з мэтай размеркавання мастацка-выразных і тэхнічна-выканальніцкіх сродкаў народных духавых інструментаў;

– зрабіць музыказнаўчы і выканальніцкі аналіз музычнага твора, скласці спіс адпаведнага музычна-інструментальнага арсенала з улікам неабходнай адаптацыі і вызначэннем аптымальнай танальнасці і тэсітуры гучання;

– напісаць характарыстыкі народных духавых інструментаў з улікам іх функцыянальных і мастацка-выканальніцкіх асаблівасцей (лабіяльныя ці флейтавыя; язычковыя; амбушурныя ці мундштучныя);

– скласці характарыстыкі народных ударных інструментаў з улікам іх функцыянальных і мастацка-выканальніцкіх асаблівасцей (ідыяфоны; мембранафоны);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– вызначыць інтэрвал транспазіцыі для транспануючых інструментаў з мэтай аператыўнай працы падчас рэпетыцыі з фальклорным калектывам;

– саставіць спіс асноўных тыповых саставаў фальклорных калектываў (капэлы, аркестры, ансамблі – аднайменныя, роднасныя, змешаныя) і напісаць характарыстыкі іх гучання;

– адзначыць функцыянальныя, мастацка-выканальніцкія асаблівасці ансамбляў народных духавых, ударных інструментаў, напісаць прыклады іх выкарыстання ў сучаснай айчыннай ці сусветнай фальклорна-выканальніцкай практыцы;

– адзначыць функцыянальныя, мастацка-выканальніцкія асаблівасці аркестраў, капэл, у складзе якіх народныя духавыя і ўдарныя інструменты, напісаць прыклады іх выкарыстання ў сучаснай айчыннай ці сусветнай выканальніцкай, фальклорна-выканальніцкай практыцы;

– напісаць прыклады размеркавання галасоў у ансамблях народных духавых і ўдарных інструментаў у адпаведнасці з іх нотна-графічным афармленнем;

– напісаць прыклады размеркавання галасоў у аркестрах, капэлах, у складзе якіх – народныя духавыя і ўдарныя інструменты, у адпаведнасці з іх нотна-графічным афармленнем.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Методыкі навучання

Пры выкладанні матэрыялаў па дысцыпліне «Методыка работы з фальклорным калектывам» выкарыстоўваюцца наступныя сучасныя педагагічныя тэхналогіі:

– праблемна-модульнага навучання;

– вучэбна-даследчай дзейнасці;

– камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусіі, прэс-канферэнцыі, дэбаты і інш.);

– іграваыя тэхналогіі (дзелавыя, ролявыя, імітацыйныя ігры).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**МЕТОДЫКА РАБОТЫ**
**З ФАЛЬКЛОРНЫМ КАЛЕКТЫВАМ**

*Вучэбная праграма*
*ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне*
*для спецыяльнасці 1-16 01 06 Духавыя інструменты*
*(па напрамках), напрамку спецыяльнасці*
*1-16 01 06-11 Духавыя інструменты (народныя)*

Рэдактар Н. А. Мількевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2020. Фармат 60х84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,74. Ул.-выд. арк. 1,14. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ